КРАЕВЕДЧЕСКИЙ КЕЙС СОЛИГОРСКА

*Як вас абслугоўваюць?*

# Выстаўка мэблі

Мнагалюдна было 13 кастрычніка ў мэблевым магазіне Салігорска. Гэта выстаўка-продаж рознай мэблі прыцягнула столькі наведвальнікаў. Загадчык магазіна тав. Ларык і двое прадаўцоў ледзь паспявалі абслугоўваць пакупнікоў.

Асаблівым попытам карысталася мяккая мэбля Мінскай фабрыкі № 2, кухонная — Бабруйскай і спальная мэбля Слонімскай фабрык.

За першы дзень выстаўкі прададзена разнастайнай мэблі на 16 тысяч рублёў. Такую выручку магазін меў амаль за поўны мінулы месяц — верасень.

Прыгожа, з густам афармлена вітрына выстаўкі. Вабяць вока лёгкай канструкцыі гарнітур для гасціннай, паліраваны пад арэхавае дрэва, спальны гарнітур Слонімскай фабрыкі, кухонныя буфеты з Бабруйска.

Добра арганізаваць выстаўку-продаж мэблі работнікам магазіна дапамаглі начальнік забеспячэння аблспажыўсаюза тав. Зялінскі і работнікі Слуцкай універсальнай базы.

Выстаўка-продаж працягваецца.

Н. ПАЎЛОЎСКАЯ.